# ПАРАДАК ПРЫЁМУ Ў X КЛАС ГІМНАЗІІ

Парадак прыёму (залічэння) асоб у гімназію рэгулюецца Правіламі прыёму (залічэння) асоб для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі ў гімназіях, зацверджанымі пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 17.08.2022 № 269 (у рэдакцыі пастановы Міністэрства адукацыі ад 05.04.2024 № 39).

**У 2025 годзе кантрольная лічба прыёму ў X клас гімназіі складае 42 чалавекі.**

На павышаным узроўні будуць вывучацца настыпныя прадметы:

«Матэматыка», «Англійская мова»;

«Фізіка», «Матэматыка»;

«Хімія», «Біялогія»;

«Руская мова», «Англійская мова».

## ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ І ПРЫЁМУ (ЗАЛІЧЭННЯ) АБІТУРЫЕНТАЎ

Прыём (залічэнне) асоб у X клас гімназіі ажыццяўляецца па конкурсе на падставе вынікаў выніковай атэстацыі па вучэбных прадметах, якія выбраны для вывучэння на павышаным узроўні, і сярэдняга бала выніковай атэстацыі ў год прыёму.

Да конкурсу дапускаюцца абітурыенты, у якіх у пасведчанні аб агульнай базавай адукацыі адзнакі па кожным з вучэбных прадметаў, якія вызначаны для вывучэння на павышаным узроўні, не ніжэй за 7 (сем) балаў і сярэдні бал пасведчання аб агульнай базавай адукацыі не ніжэй за 7 (сем) балаў, пры гэтым сярэдні бал пасведчання аб агульнай базавай адукацыі вызначаецца з прымяненнем правілаў матэматычнага акруглення да адзінак (цэлых).

Конкурс пры прыёме (залічэнні) абітурыентаў у гімназію ажыццяўляецца на падставе сумы балаў вынікаў выніковай атэстацыі па вучэбных прадметах, якія выбраны абітурыентамі для вывучэння на павышаным узроўні, і сярэдняга бала выніковай атэстацыі, які вызначаецца з дакладнасцю да адзінак (цэлых).

## ДАКУМЕНТЫ, ЯКІЯ ПРАД'ЯЎЛЯЮЦЦА Ў ПРЫЁМНУЮ КАМІСІЮ ГІМНАЗІІ

У перыяд з 12 чэрвеня па 16 жніўня ў прыёмную камісію падаюцца наступныя дакументы:

1. заява ад імя непаўналетняга (са згоды аднаго з законных прадстаўнікоў), у якой павінны быць указаны вучэбныя прадметы (не больш за два), якія выбраны абітурыентам для вывучэння на павышаным узроўні;

2. пасведчанне аб агульнай базавай адукацыі;

3. дакументы, якія пацвярджаюць права на льготы (пры наяўнасці ільгот).

У прыёмную камісію прад'яўляюцца: пасведчанне аб нараджэнні або дакумент, які пацвярджае асобу непаўналетняга, медыцынская даведка аб стане здароўя.

## АСОБЫ, ЯКІЯ МАЮЦЬ ПРАВА НА ІЛЬГОТЫ ПРЫ ПРЫЁМЕ (ЗАЛІЧЭННІ) У ГІМНАЗІЮ

1. Па-за конкурсам пры паступленні ў гімназію залічваюцца пераможцы (дыпломы I, II або III ступені) заключнага этапа рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах, праведзенай Міністэрствам адукацыі ў навучальным годзе, які завяршаецца ў год прыёму (залічэння).

2. Пераважнае права пры роўнай колькасці балаў на прыём (залічэнне) у гімназію ў парадку пералічэння маюць:

пераможцы (дыпломы I, II або III ступені) рэспублікаскіх конкурсаў работ даследчага характару (канферэнцый) навучэнцаў па вучэбных

прадметах, праведзеных Міністэрствам адукацыі ў навучальным годзе, які завяршаецца ў год прыёму (залічэння);

пераможцы (дыпломы I, II або III ступені) трэцяга этата рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах, праведзенай Міністэрствам адукацыі ў навучальным годзе, які завяршаецца ў год прыёму (залічэнні);

асобы, якія маюць па выніках выніковай атэстацыі больш высокі сярэдні бал па вучэбных прадметах, якія выбраны імі для вывучэння на павышаным узроўні;

асобы, якія маюць больш высокі сярэдні бал па выніках выніковай атэстацыі.